нараджальнасці вырас да 11,5, што вышэй, чым у краінах Еўропы. У 2019 г. назіралася нязначнае зніжэнне нараджальнасці.

Другі працэс, які вызначае характар натуральнага руху насельніцтва, — смяротнасць. У сярэдзіне XX ст. у Беларусі яна зніжалася, расла сярэдняя працягласць жыцця. У другой палове XX ст. смяротнасць стала павялічвацца. Найбольш высокія тэмпы павелічэння смяротнасці назіраліся паміж перапісамі 1989 і 1999 гг. (з 10,6 да 14,2 на 1000 чал.). Пачынаючы з 2010 г. назіраецца зніжэнне агульнага каэфіцыента смяротнасці да 12,8 на 1000 чал.

На карце атласа (с. 33) вызначце раёны, для якіх характэрны натуральны прырост насельніцтва.

**Падвядзём вынікі.** Колькасць насельніцтва Беларусі на 2023 г. — 9200,6 тыс. чал. Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва — 44,3 чал./км$^2$.

Найбольшая шчыльнасць насельніцтва ў Мінскай вобласці, найменшая — у Віцебскай. Колькасць гарадскога насельніцтва перавышае колькасць сельскага.

***Праверце сябе.*** 1. Што такое размяшчэнне насельніцтва? 2. Якія фактары ўплываюць на размяшчэнне насельніцтва? 3. Якая сярэдняя шчыльнасць насельніцтва Беларусі?

***Праблемныя пытанні.*** 1. Назавіце прычыны змянення колькасці насельніцтва Беларусі ў канцы XX — пачатку XXI ст. 2. Якія фактары паўплывалі на размяшчэнне насельніцтва вобласці, у якой вы жывяце?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Па даных малюнка 80 разлічыце тэмпы прыросту і змяншэння насельніцтва Беларусі (гарадскога і сельскага) і растлумачце прычыны змянення колькасці насельніцтва на кожным адрэзку.

## § 23. Полаўзроставая структура насельніцтва. Працоўныя рэсурсы

***Успомніце.*** *Чаму важнай часткай насельніцтва з'яўляюцца працоўныя рэсурсы?*

**1. Полаўзроставая структура насельніцтва.** Насельніцтва любой краіны адрозніваецца па ўзросце і поле, што звязана з асаблівасцямі ўзнаўлення і ўзроўнем сацыяльна-эканамічнага развіцця. Па ўзросце і ступені працаздольнасці насельніцтва падзяляецца на тры групы: маладзейшыя за працаздольны ўзрост, працаздольнага ўзросту і старэйшыя за працаздольны ўзрост. Доля кожнай узроставай групы насельніцтва ў працэсе гістарычнага развіцця змяняецца. Па ўзроставай структуры насельніцтва Беларусь падобная да многіх краін Еўропы. Яна характарызуецца



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 81. Узроставая структура насельніцтва Беларусі, %

Для якіх краін Еўропы характэрная найбольш высокая доля пажылых людзей?

зніжэннем удзельнай вагі дзяцей і павелічэннем долі людзей, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту. Дынаміка ўзроставай структуры насельніцтва Беларусі па выніках перапісаў паказана на малюнку 81.

З малюнка вынікае, што найбольшай з'яўляецца доля насельніцтва працаздольнага ўзросту, якая ў апошнія 65 гадоў складала 50–60 %. На працягу апошніх 100 гадоў доля дзіцячага насельніцтва ў краіне зніжаецца, а доля насельніцтва, старэйшага за працаздольны ўзрост, павялічваецца. Гэта тлумачыцца больш высокімі тэмпамі зніжэння нараджальнасці ў параўнанні са смяротнасцю, ростам сярэдняй працягласці жыцця, што вядзе да інтэнсіўнага старэння насельніцтва. Па выніках апошняга перапісу, у Беларусі доля насельніцтва ва ўзросце, старэйшым за працаздольны, складае 24,5 %, г. зн. амаль кожны чацвёрты.



На падставе Указа Прэзідэнта «Аб удасканаленні пенсійнага забеспячэння» была праведзена пенсійная рэформа. З 01.01.2017 мінімальны ўзрост для афармлення працоўнай пенсіі штогод павялічваўся на 6 месяцаў і на пачатак 2022 г. склаў 58 гадоў для жанчын і 63 гады для мужчын. Чым была выклікана неабходнасць правядзення ў Беларусі гэтай рэформы?

У структуры насельніцтва па поле ў Беларусі пераважаюць жанчыны — каля 54 %. Гэта тлумачыцца неаднолькавай працягласцю жыцця мужчын і жанчын. Сярэдняя працягласць жыцця мужчын складае каля

Як вы думаеце, чым тлумачыцца большая працягласць жыцця ў жанчын?

70 гадоў, а жанчын — каля 80 гадоў. Увогуле ў свеце хлопчыкаў нараджаецца больш, чым дзяўчынак, у Беларусі — прыкладна на 5 %. Аднак з-за іх больш высокай смяротнасці ў дзіцячым узросце колькасць мужчын і жанчын выраўноўваецца да 20–24 гадоў. На працягу наступных 10 гадоў нязначна пераважае жаночае насельніцтва, а потым доля жаночага насельніцтва павялічваецца больш высокімі тэмпамі. Ва ўзросце, старэйшым за 70 гадоў, жаночае насельніцтва перавышае мужчынскае ў 2–2,5 разу. Сярэдні ўзрост насельніцтва ў Беларусі паступова павялічваецца: у 2023 г. ён склаў 38,4 года ў мужчын, 43,6 года ў жанчын. Для прыкладу, сярэдні ўзрост жыхароў планеты складае 33 гады, Еўропы — 43 гады. Наглядным адлюстраваннем структуры насельніцтва з'яўляецца полаўзроставая піраміда.

Прааналізуйце полаўзроставую піраміду на с. 32 атласа і растлумачце адрозненні па поле ва ўзроставых групах гарадскога і сельскага насельніцтва.

**2. Працоўныя рэсурсы.** Для эканамічнага развіцця краіны найважнейшую ролю адыгрывае насельніцтва працаздольнага ўзросту, якое адносіцца да працоўных рэсурсаў. У Беларусі працаздольны ўзрост для жанчын — ад 16 да 58 гадоў, для мужчын — ад 16 да 63 гадоў. Аднак шахцёры, металургі, вайскоўцы і прадстаўнікі іншых прафесій з цяжкімі ўмовамі працы маюць права на датэрміновы выхад на пенсію. Ёсць людзі, якія не могуць працаваць па стане здароўя. Таму да працоўных рэсурсаў адносяцца не ўсе асобы працаздольнага ўзросту. Беларусь валодае значнымі па колькасці і высокімі па якасці працоўнымі рэсурсамі, якія ўключаюць 61 % усяго насельніцтва краіны. Асноўную частку складае працаздольнае насельніцтва ў працаздольным узросце (94,3 %). Да працоўных рэсурсаў таксама адносяцца старэйшыя і маладзейшыя за працаздольны ўзрост асобы, якія працуюць.

Агульная сярэднегадавая колькасць працоўных рэсурсаў краіны ў 2023 г. склала 5598,4 тыс. чалавек (мал. 82). З 2008 г. з'явілася тэндэнцыя скарачэння гэтага паказчыка. У большасці рэгіёнаў скарачэнне колькасці працоўных рэсурсаў пачалося яшчэ на пачатку 2000-х гг. Выключэнне складае г. Мінск, дзе дадатная дынаміка колькасці працоўных рэсурсаў захоўвалася да 2011 г.

Для сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны важнае значэнне мае якасны склад працоўных рэсурсаў. Ён вызначаецца прафесійным складам, узроўнем адукацыі і кваліфікацыі, сярэднім узростам.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 82. Змяненне колькасці працоўных рэсурсаў Беларусі, тыс. чал.

Высокі ўзровень адукацыі працоўных рэсурсаў з'яўляецца базавай умовай інавацыйнага развіцця. У Беларусі 26,6 % насельніцтва, старэйшага за 15 гадоў, мае вышэйшую адукацыю.

Найбольшая доля насельніцтва з вышэйшай адукацыяй у Мінскім, Брэсцкім, Полацкім і Аршанскім раёнах. У перспектыве попыт на кваліфікаваныя рэсурсы будзе расці.

**3. Занятасць працоўных рэсурсаў. Эканамічна актыўнае насельніцтва.** Асноўная частка працоўных рэсурсаў занятая ў сферы матэрыяльнай вытворчасці або ў сферы паслуг. Яны адносяцца да эканамічна актыўнага насельніцтва.

**Эканамічна актыўнае насельніцтва** — частка насельніцтва, якая ўдзельнічае або мае магчымасць удзельнічаць у вытворчасці тавараў і паслуг.

Міжнародная арганізацыя працы ў гэтую катэгорыю ўключае людзей ва ўзросце ад 15 да 72 гадоў. Эканамічна актыўнае насельніцтва можна падзяліць на занятых і беспрацоўных. Асаблівасць гэтага паказчыка ў тым, што ён залежыць ад самавызначэння чалавека. Так, некаторыя групы грамадзян могуць быць аднесены да эканамічна актыўнага насельніцтва толькі часткова. Напрыклад, студэнты ўстаноў вышэйшай адукацыі або пенсіянеры могуць адносіцца да дадзенай катэгорыі пры частковай занятасці, а могуць і не адносіцца.

Для далучэння моладзі да грамадска карыснай працы і атрымання працоўных навыкаў у Рэспубліцы Беларусь арганізуецца часовая працоўная занятасць моладзі. Для вучняў з 14 гадоў арганізавана другасная занятасць, студэнцкія атрады, працуюць лагеры працы і адпачынку. У якіх з пералічаных формаў часовай працоўнай занятасці вы бралі ўдзел? Ці з'яўляюцца ўдзельнікі часовай працоўнай занятасці эканамічна актыўным насельніцтвам краіны?

Структура занятага насельніцтва па галінах і відах эканамічнай дзейнасці падобная па абласцях і краіне ў цэлым (мал. 83). У сферы паслуг занята 61,7 %, а ў сферы вытворчасці — 38,3 %. У прамысловасці ў сярэднім занята 24 %, у будаўніцтве, транспартнай дзейнасці, адукацыі, ахове здароўя, сельскай гаспадарцы — 7–10 %. Значная розніца паказчыкаў характэрная для гандлю. Калі ў абласцях у гандлі занята 12 % насельніцтва, то ў Мінску паказчык дасягае 19 %. Гэта тлумачыцца высокімі даходамі і спажываннем у сталіцы.

Нераўнамерна размеркавана занятае насельніцтва па адміністрацыйных раёнах. Найбольшая яго колькасць назіраецца ў Мінскім і Барысаўскім раёнах, дзе гэты паказчык перавышае 80 тыс. чал. Высокая занятасць у Мазырскім, Маладзечанскім, Салігорскім, Лідскім, Жлобінскім раёнах. Якія фактары ўплываюць на нераўнамернае размеркаванне занятага насельніцтва? Чаму менавіта ў гэтых раёнах вялікая колькасць занятага насельніцтва?

Калі частка эканамічна актыўнага насельніцтва хоча працаваць, але не можа працаўладкавацца па розных прычынах, узнікае такая з'ява, як




Мал. 83. Структура занятасці насельніцтва Беларусі па відах эканамічнай дзейнасці, %



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

беспрацоўе. У Беларусі яна мае невялікія памеры. Дзяржаўная служба занятасці насельніцтва вядзе ўлік свабодных працоўных месцаў, рэгістрацыю беспрацоўных, ажыццяўляе працаўладкаванне і перападрыхтоўку кадраў, выплату дапамог па часовым беспрацоўі.

Узровень зарэгістраванага беспрацоўя ў 2023 г. склаў 3,5 % ад эканамічна актыўнага насельніцтва Беларусі. На працягу апошніх 10 гадоў ён зніжаецца. Праблемай занятасці насельніцтва з'яўляецца скрытае беспрацоўе. Яно характарызуецца тым, што пэўная доля працаздольнага насельніцтва толькі часткова забяспечана працоўнымі месцамі. Частковая занятасць — магчымасць працаваць сезонна ці няпоўны працоўны дзень.

**Падвядзём вынікі.** Для насельніцтва Беларусі характэрнае перавышэнне долі насельніцтва ва ўзросце, старэйшым за працаздольны, над дзіцячым насельніцтвам. У насельніцтве краіны пераважаюць жанчыны. Доля працаздольнага насельніцтва ў працоўных рэсурсах перавышае 94 %. Больш за 60 % эканамічна актыўнага насельніцтва занята ў сферы паслуг, каля 40 % — у сферы вытворчасці.

***Праверце сябе.*** 1. У чым заключаюцца асаблівасці ўзроставай структуры насельніцтва Беларусі? 2. Якую інфармацыю можна атрымаць з аналізу полаўзроставай піраміды? 3. Чаму колькасць працоўных рэсурсаў меншая за колькасць асоб працаздольнага ўзросту? 4. Якое насельніцтва адносіцца да эканамічна актыўнага?

***Праблемныя пытанні.*** 1. Растлумачце, чаму ў наш час павялічваецца доля эканамічна актыўнага насельніцтва, занятага ў сферы паслуг, і як на гэта ўплывае якасны склад працоўных рэсурсаў. 2. Як якасці чалавека могуць гарантаваць канкурэнтаздольнасць на рынку працы? Якія геаграфічныя веды пры гэтым будуць неабходныя?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Па картах атласа (с. 32) вызначце ўзроставую структуру гарадскога і сельскага насельніцтва вашага раёна.

## § 24. Міграцыя насельніцтва. Этнічны і рэлігійны склад насельніцтва

***Успомніце.*** *Што такое міграцыя насельніцтва? Што такое этнас? Назавіце сусветныя рэлігіі.*

**1. Міграцыя насельніцтва.** На змяненне колькасці насельніцтва Беларусі і яе рэгіёнаў таксама ўплывае міграцыя. Міграцыйная актыўнасць у Беларусі павышалася на працягу XX ст.